ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫ БЮЛЕТЭНЬ

# ДЗЕДЗІЧ

ДЗЕДЗІЧ
Зберагчы і павяднцыў

*Для Бацькаўшчыны-маці буду йграць.*
*(Янка КУПАЛА)*

**№ 3 (34)**
**ТРАВЕНЬ 2005**

2 ЖЫВЕМ НЕ ГОРШ, ЧЫМ...
Або «Хто да чаго імкнецца»

4 МОЛАДЗЕВАЯ ІНІЦЫЯТЫВА «АНТЫФА»
Змагаецца з фашызмам у Берасці

6 РОЖЫ ДЛЯ ЖЫДОВАК
Тэзаўрус: Новая рубрыка «Дзедзіча»

8 БОЛЬШОЙ СЕКС
В МАЛЕНЬКОМ ГОРОДЕ

# «СВЕЧКУ ПАМЯЦІ»

## ПАГАСІЛА МІЛІЦЫЯ

**МІЛІЦЫЯ РАЗАГНАЛА ЎДЗЕЛЬНІКАЎ АКЦЫІ "СВЕЧКА ПАМЯЦІ". ЁСЦЬ ЗАТРЫМАНЫЯ.**

Каля 40 прадстаўнікоў дэмакратычных арганізацый Берасця прынялі 26 красавіка ўдзел у акцыі "Свечка памяці", прысвечанай 19-й гадавіне аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Удзельнікі акцыі, у асноўным маладыя людзі, прайшлі па цэнтральных ву-ліцах горада з запаленымі лампадкамі ў руках, раздаючы мінакам улёткі з інфармацыяй аб сапраўдных наступствах Чарнобыльскай катастрофы. Большасць берасцейцаў з цікаўнасцю паставілася да акцыі і ўважліва праглядала змест улётак.

Але на скрыжаванні вуліц Савецкай і Гогаля рух акцыі спынілі супрацоўнікі Аддзела аховы Ленінскага РАУС. Па іх словах, акцыя незаконная, бо ўлёткі надрукаваныя ў Смаленску, а значыць, не могуць распаўсюджвацца на тэрыторыі Беларусі.



Калі арганізатары мерапрыемства прынялі рашэнне пагасіць "Свечку памяці", міліцыянты пачалі перасследаваць найбольш актыўных удзельнікаў. У выніку была затрыманая 20-цігадовая Аксана Цімчанка, студэнтка аднаго з менскіх ВНУ. Разам з ёю ў Ленінскі РАУС г. Берасця даставілі яшчэ аднаго ўдзельніка акцыі, кіраўніка БАМГА "Сузор'е" сп. Дзмітрыя Шыманскага.



Міліцыянт вывучае змест улёткі

На Аксану Цімчанку быў складзены адміністрацыйны пратакол за незаконны распаўсюд друкаванай прадукцыі, у яе былі адабраныя 70 асобнікаў улётак. Варта адзначыць, што Аксана не распаўсюджвала ўлёткі і толькі-толькі далучылася да акцыі. Па яе словах, яна падтрымала "Свечку памяці" з-за пачуцця еднасці са сваякамі, якія жывуць на забруджаных радыяцыяй тэрыторыях.

– Я не лічу, што парушыла закон, і мне незразумела, за што мяне затрымалі, – кажа Аксана. ¨й пагражае папярэджанне альбо штраф памерам да 5-ці базавых адзінак (60 даляраў ЗША).

Дзмітрый Шыманскі быў здзіўлены тым, што на яго пратакол не складалі, хаця міліцыянты бачылі яго сярод удзельнікаў.

– Я лічу, – адзначыў сп. Д.Шыманскі, – што міліцыянты не мелі маральнага права праводзіць затрыманні падчас такой акцыі. Мы, на жаль, дарма спадзяваліся, што ўдзельнікаў шэсця, якое ўшаноўвае памяць аб ахвярах Чарнобылю, міліцыя чапаць не будзе. Хаця б з-за таго, што сярод "ліквідатараў" наступстваў аварыі, якія пасля памералі ад радыяцыі, былі іхнія калегі і саслужбоўцы. Шкада, што нашы спадзяванні аказаліся марнымі.

А тое, што адбылося, сп. Д.Шыманскі назваў акцыяй запалохвання берасцейскай моладзі: пакарай штрафам аднаго, іншыя ў наступны раз пабаяцца:

– Пры нашай судовай сістэме, калі ўсіх суддзяў прызначае і здымае асабіста сп. Лукашэнка, спадзявацца на аб'ектыўны разгляд справы не прыхо-дзіцца. Але ў нас знойдуцца сродкі, каб кампенсаваць магчымы штраф. Больш за тое, калі ў Аксаны будуць праблемы з вучобай, мы накіруем яе на навучанне ў адзін з універсітэтаў Польшчы ці Чэхіі, дзе яна атрымае адукацыю еўрапейскага ўзроўню. Рэпрэсіямі ўлады не здолеюць запалохаць моладзь. Бо мы ведаем, што ў падтрымку дэмакратыі ў Беларусі выступіла ўся Еўропа. І сёння маладыя людзі, адчуваючы гэтую падтрымку, больш не баяцца пратэставаць супраць аўтарытарнага рэжыму Лукашэнкі.

– Да 2006г. у міліцыі яшчэ ёсць час, каб вызначыцца, каму яна служыць – рэжыму ці народу, – адзначыў Дзмітрый Шыманскі.

**Dzedzich week-news**

## РЫГОР БАРАДУЛІН ПРЫСВЯЦІЎ ВЕРШ «ДЗЕДЗІЧУ»

У смутны час, калі грамадства губляе маральныя арыенціры, а ў галовах "дзяржаўных мужоў" пануе цемрашальства, такая адзнака нашай дзейнасці – як глыток свежага паветра.

"Нязломнымі і дужымі" нас робіць падтрымка шчырых беларусаў, нашых духоўных настаўнікаў, такіх, як Рыгор Барадулін.

**VIVAT!**

На тое, што дзеецца сёньня,
Гледзячы,
Патрапіць лёгка ў вар'яцкі дом.
Але калі пачытаеш "Дзедзіча",
Твой дух пачынае лунаць арлом.

Нязломным і дужым
Пан Лёс лагодзіць.
Жыве Беларусь,
Покуль сонца ўзыходзіць!

29.03.05



**Дзякуй табе, дзядзька Рыгор!**

## АДНЫМ РАДКОМ

### МОЛАДЗЬ ПАТРАБУЕ ЯКАСНЫХ «ГУКАЎ»

Брэсцкае абласное маладзёжнае грамадскае аб'яднанне "Сузор'е" з 15 красавіка распачало акцыю "ГУКі".

Акцыя накіравана на папулярызацыю беларускамоўнай музыкі сярод берасцейскай моладзі. Яе сэнс у тым, што любы малады чалавек можа абсалютна бясплатна памяняць непатрэбныя аудыёкасеты на "б/у" касеты з запісамі беларускіх музыкаў.

Прычым можна на свой уласны музычны густ выбраць любога беларускага выканаўцу: ад бардаў Шалкевіча ці Бартосіка да папулярных "Нейра-дзюбеля" ці "Крамы". Адзіная ўмова – касеты, якія вы прыносіце на абмен, павінны быць у рабочым стане (здатныя да перазапісу), каб акцыя працягвалася далей.



Арганізатары акцыі запэўніваюць, што любы малады чалавек знойдзе ў іх музыку на свой густ: аудыёархіў "Сузор'я" налічвае больш за 500 гадзін беларускамоўнай музыкі, альбо 35Гб у электронным фармаце.

Па словах актывіста БАМГА "Сузор'е" і ініцыятара "ГУКаў" сп. Сяржука Ратнікава, штуршком да акцыі стала незадаволенасць берасцейскай моладзі рашэннем Міністэрства інфармацыі выдзеліць 75% эфіру FM-станцый для беларускіх выканаўцаў:

– Справа не ў адсутнасці патрыятызму ў берасцейскай моладзі. Проста існуе так званы "Спіс беларускіх аўтараў і выканаўцаў", рэкамендаваных для трансляцыі ў FM-эфіры, у які Міністэрства інфармацыі "забылася" ўключыць грамадска актыўных "Палац", "Нейра-дзюбель" ды іншых. І атрымліваецца, што на слухачоў радыёстанцый ільецца нізкаякасная папса, непрафесійна скапіраваная з расейскай эстрады.

Натуральна, у людзей складаецца ўражанне, што якаснай беларускай музыкі не існуе і існаваць не можа.

Вось жа каб абвергнуць такія падазрэнні і пазнаёміць берасцейскую моладзь з сапраўды добрай беларускай музыкай, мы і распачалі акцыю "ГУКі". Безумоўна, распаўсюд музыкі ажыццяўляецца са згоды праваўладальнікаў і ў адпаведнасці з Законам аб аўтарскім праве.

Застаецца дадаць, што акцыя будзе доўжыцца да 1 чэрвеня.

Каб абмяняць свае касеты ці задаць пытанні арганізатарам акцыі, тэлефануйце:
(0162) 23-68-02, (029) 77-949-77.

**Dzedzich week-news**

**Шаноўныя сябры!**

**Рэдакцыя "Дзедзіча" з задавальненнем прыме ад Вас бясплатныя прыватныя аб'явы ў наступны нумар бюлетэня, які пабачыць свет у сярэдзіне чэрвеня 2005 г.**

**Звяртайцеся па тэл.: (0162) 23-68-02 да 20.05.05.**

# ЖИВЁМ НЕ ХУЖЕ...
## ИЛИ «КТО К ЧЕМУ СТРЕМИТСЯ»

**1994 ГОД. МНЕ НЕТ ЕЩЁ И ДЕСЯТИ ЛЕТ, НО ПРЕЗИДЕНТСКИЕ ВЫБОРЫ МНЕ ЗАПОМНИЛИСЬ.**

Кандидатов было двое. Первым был какой-то старый дядька с постным лицом, которого я видел несколько раз по телевизору… Второй появился как-то неожиданно, про него я ничего раньше не слышал, но меня очень удивило, откуда к нему такая любовь людей. А если кто-то говорил, что за него голосовать не надо, то на этого несчастного набрасывались чуть ли не с кулаками и криками – ЛЕПШАГА НЕ БУДЗЕ, ТРЭБА ГАЛАСАВАЦЬ ЗА ЯГО, БО ¨Н ХОЦЬ МАЛАДЫ, НАВЯДЗЕ ПАРАДАК!

Надо признаться, на меня этот дядька с усами произвёл большое впечатление, и как же я обрадовался, когда он стал президентом. Прошло несколько лет, и к следующим выборам такого энтузиазма у людей не наблюдалось. Остались лишь чуть-чуть изменённые фразы – ЛЕПШАГА ЎС¨ РОЎНА ПАКУЛЬ НЯМА, А ГЭТЫ ХОЦЬ ПЕНСІЮ ПЛАЦІЦЬ, ДЫ І ПАГЛЯДЗІЦЕ: НА УКРАІНЕ І Ў РАСЕІ ГОРШ ЖЫВУЦЬ.

Стоит отдать должное, президент знал на что делать ставку – наш народ повидал столько горя, что любые признаки стабильности радовали. Зарплата маленькая, но вовремя, чиновник обидел – напиши президенту и он по телевизору публично их ПЕРАТРАХНЕ и прикажет разобраться…

А годы шли… Вначале пришлось отстать от ЛИТВЫ. Уж слишком быстро эта страна стала жить хорошо. Даже наши мастера-болботуны с БТ не могли найти ни одного более-менее приличного недостатка, которым можно было бы напугать: "Видите чего хотят наши СВЯДОМЫЕ".

Пришлось переключиться на Россию. Даже несмотря на то, что у нас как-бы союз. Однако и эта лавочка потихоньку прикрылась, когда братские продукты завалили наши рынки, а мужики стали массово уезжать на заработки в Москву, Питер и богатую на ресурсы Сибирь.

Но в запасе оставалась Украина. Так и здесь, блин, неспадзянка. ВВП южной соседки стремительно растет, а наш – нет, да еще и революция "оранжевая" подоспела. Того и гляди – в Евросоюз вступят. А там инвестиции, кредиты разные, ещё и нас перегонят. Догони попробуй.

Итак уже одиннадцатый год. Только вот возникает вопрос: "Стоит ли искать тех, кто живет хуже нас? Может всё-таки надо стремиться к лучшему?" Это, конечно, намного сложнее, но единственно верно. Ведь сама сущность человека состоит в том, чтобы идти вперед, а не стоять на месте или, тем более, пятиться назад. Согласитесь, лучше сладкая усталость в теле после проделанной работы, чем самодовольство и злорадство, что кто-то живёт хуже нас.

От нас, молодежи, это в первую очередь и зависит. Понятно, что злорадствовать нашему возрасту не свойственно, однако и равнодушными оставаться не стоит, а то придётся нашему поколению в ближайшие лет десять слушать о том, как мы хорошо живем по сравнению со странами Африки, благодаря вовремя и, главное, верно выбранному курсу.

Так что решайте – один шанс у нас ещё есть!

**Андрей ПАВЛОВИЧ**

# МОЛАДЗЬ ВЫВУЧАЕ ЕЎРОПУ

**СЕМІНАР "АГУЛЬНАЕЎРАПЕЙСКІ ДЭМАКРАТЫЧНЫ ДОСВЕД І ЯГО ЗАПАТРАБАВАНАСЦЬ ДЛЯ БЕЛАРУСІ" ПРАЙШОЎ 24 КРАСАВІКА 2005Г. У ПАМЯШКАННІ БАМГА "СУЗОР'Е".**

Галоўная ідэя такіх сустрэч – непасрэдны кантакт з рэгіянальнай аўдыторыяй, перадача інфармацыі пра агульнаеўрапейскі палітычны досвед і перспектывы Беларусі ў Еўропе.

Удзельнікамі семінара сталі 35 чалавек – прадстаўнікі грамадскіх арганізацый, палітычных партый і проста грамадска актыўная моладзь.

Выступоўцы, сярод якіх былі знаны палітолаг Віктар Чарноў, кіраўнік "Таварыства філаматаў" Валянцін Голубеў, ініцыявалі плённыя дыскусіі па актуальных для беларускага грамадства пытаннях: аб еўрапейскіх каранях беларускага менталітэту, еўрапейскіх каштоўнасцях і іх прыдатнасці для Беларусі, аб перспектывах станаўлення грамадзянскай супольнасці ў краіне і інш.

Арганізатары і ўдзельнікі сышліся ў думцы пра неабходнасць такога кшталту сустрэч дзеля абмену досведам і прарыву інфармацыйнай блакады, спрыяння пабудове ў Беларусі грамадзянскай супольнасці.

Кіраўнік БАМГА "Сузор'е" Дзмітрый Шыманскі ад імя ўсіх удзельнікаў падзякаваў выступоўцам і арганізатарам (ГА "Таварыства філаматаў") за праведзены семінар:

– Сённяшні семінар – гэта не толькі адукацыя і абмен неабходнымі ў грамадскай дзейнасці ведамі. Улічваючы тое, што ў 2006г. падчас прэзідэнцкіх выбараў усе мы будзем працаваць разам, для нас гэта цудоўная магчымасць бліжэй пазнаёміцца адзін з адным, каб бачыць, поплеч з кім мы будзем дамагацца перамогі адзінага кандыдата ў прэзідэнты ад дэмакратычнай кааліцыі.

**Dzedzich week-news**

## ЦЫТАТА МЕСЯЦА

***Нікому не выгадная гэтая апошняя дыктатура ў Еўропе, якой з'яўляецца ўлада Лукашэнкі ў Беларусі...***

***...Чаму гэта кепска для людзей – скінуць ярмо тыраніі і вырашыць, што яны самі хочуць кантраляваць уласную будучыню?***

**Кандаліза Райс, дзяржсакратар ЗША**
**(з інтэрв'ю радыёстанцыі "Эхо Москвы" і тэлекампаніі "CNN")**



# ДЗЕ НАРАДЖАЕЦЦА ІСЦІНА

**ДОБРАЯ РЭЧ – INTERNET. АСАБЛІВА ЯГО ІНТЭРАКТЫЎНАЯ ЧАСТКА – ФОРУМЫ, ЧАТЫ, ГАСЦЁЎНІ. МОЖНА ПАРАЗМАЎЛЯЦЬ, ЗНАЙСЦІ АДНАДУМЦАЎ, ПАЗНАЁМІЦЦА З СУПРАЦЬЛЕГЛЫМ ПУНКТАМ ГЛЕДЖАННЯ, ДАВЕДАЦЦА ШМАТ НОВАГА (ПРА СЯБЕ Ў ТЫМ ЛІКУ), «НАБІЦЬ МОРДУ» (ВІРТУАЛЬНА), ЗАНЯЦЦА СЭКСАМ (ТАКСАМА, І НЕ ТОЛЬКІ)...**

Але нашай мэтай будзе даведацца, што думае насельніцтва форумаў Берасцейшчыны пра такую далікатную справу, як палітыка.

Пачнем агляд з **Берасцейскага форума** (forum.brest.by) -> О жизни -> Политика. У гэтым раздзеле гаворка выходзіць за межы, акрэсленыя назвай.

Тэма пачынаецца наступным пастом:

"Белорусская нация...

А существует ли она? На белорусском языке говорят пару процентов населения. В народе не осталось ничего святого, никакого патриотизма. Все валом выезжают за границу... У людей никаких культурных ценностей. Страна задыхается. А кто в этом виноват?..."

І пачынаецца размова пра нацыянальнасць ды нацыю, патрыятызм ды нацыяналізм. Пасля гаворка пераходзіць на месца Беларусі ў гісторыі, узаемаадносіны з суседзямі. З'яўляецца фраза: "А про универ ты мне не распрягай. Знаю я это гнездо белорусского шовинизма!" Зноў пра нацыстаў ды пра патрыётаў.

Спроба пачаць гаварыць пра палітыку была зроблена, калі адзін з фарумчанаў паведаміў аб стварэнні т.зв. "Движения в Байнете" Уладзіміра Мацкевіча (worvik.com), ды запрасіў да дыскусіі на гэтую тэму. Пасля гэтага гутарка пайшла пра палітыку на міжнароднай арэне, НАТО, ЕС.

З'яўляецца спроба ажывіць форум навіной пра прыгоды баранавіцкіх КВНшчыкаў у Менску, і як вынік – прыгоды адказных асобаў БарДУ.

Пасля гэтага мы можам парадавацца: нам паведамляюць, што за такія размовы часам адключаюць сервер, а некаторых выганяюць з інтэрнатаў, выпадкі ўжо былі. Але нашых храбрацоў гэта ніколькі не засмучае, і мы вядзем гутарку далей. Гаворым пра ўплыў на нас нашых суседзяў – Расеі і Польшчы. Шукаем вінаватых у нашым становішчы, галоўныя з іх – ЗША і Расея. Размова працягваецца аб сусветнай палітыцы.

## BRESTONLINE FORUM

Тэмы падымаюцца вельмі важныя, і – адпаведныя падфорумы:

1. **Давайте подумаем вместе.** Уздымаецца пытанне: "Што павінна адбыцца ў нашай краіне, каб цяперашняе становішча змянілася? Што мы можам зрабіць дзеля гэтага?"

2. **Теперь давить людей танками стало возможным.** Паведамляецца аб прыняцці папраўак у Закон "Аб Унутраных войсках МУС Рэспублікі Беларусь", згодна якіх цяпер ваеннаслужачым Унутраных войскаў, АМАПу, міліцыянтам прадастаўлена права прымяняць спецсродкі, баявую тэхніку і зброю па указанні прэзідэнта.

3. **О пропаганде как таковой.** Ідзе спасылка на Энцыклапедыю метадаў прапаганды. Як нас апрацоўваюць СМІ, палітыкі, рэклама.

4. **Забастовка с 1 марта.** Аб праведзеным страйку прадпрымальнікаў і безвыніковасці перамоваў з уладамі.

5. **Железный занавес.** Паведамляецца пра Дэкрэт прэзідэнта "Аб некаторых мерах па супрацьдзеянні гандлю людзьмі".

6. **ЕС официально признал Лукашенко диктатором.** Аб стаўленні Еўрасаюза да нашага рэжыму, да асобы прэзідэнта, якое вылілася ў прыняццё рэзалюцыі Еўрапарламента 10 сакавіка ў Страсбургу.




7. **Нападки официальных властей на Интернет.** Аб жаданні ўладаў кантраляваць апошнюю крыніцу інфармацыі. Аб закрыцці на форумах Гародні, Магілёва, Маладзечна палітычнай галінкі і звальненні ў Гародні адміністратара форума.

Тутэйшы форум выконвае функцыю хутчэй інфармацыйную, чым дыскусійную. Але і гэта зусім нядрэнна, бо інфармаванне нашага грамадства застаецца вельмі вялікай праблемай.

## ВІРТУАЛЬНЫ БРЭСТ

А вось, на жаль, на форуме Віртуальнага Брэста (forum.virtualbrest.com) пазбягаюць дыскусіі і інфармавання на палітычныя тэмы. Хаця колькасць карыстальнікаў даволі вялікая для таго, каб сярод іх узнік інтарэс да гэткіх тэмаў.

## ФОРУМ ПІНСКА

Сапраўдны выбух меркаванняў і поглядаў мы бачым на форуме Пінска (forum.mypinsk.com). Тут размяшчаюцца ажно дзве галінкі цікавай нам тэмы – Патрыятызм і Палітыка. Кожная з іх разбіта на шмат падфорумаў, дзе ідзе жывая дыскусія на тэмы ад БРСМ да "За што Вы кахаеце Беларусь?", ад "Памаранчавых" да "Рэвалюцыі" 25 сакавіка...

## ПАРТАЛ БАРАНАВІЧАЎ

На Форуме афіцыйнага партала горада Баранавічы (www.baranovichy.by/forum) вы можаце адшукаць толькі тэму "Жыве Беларусь!" у раздзеле "Пытанні культуры, мовы, моды". Гэтая тэма адкрылася 25 сакавіка і там вісіць толькі некалькі пастоў на тэму стварэння БНР. А таксама ў раздзеле "Рознае" вы знойдзеце тэму "Рэвалюцыя ў Менску правалілася".

У выніку азнаямлення з жыццём на форумах мы бачым: колькі людзей, столькі і меркаванняў. Некаторыя мяняюць свае пазіцыі, некаторыя – не. Урэшце, у добрай спрэчцы павінна нарадзіцца ісціна.

**Сяржук ЛАЗЕНКА**

**P.S.** Пакуль нумар рыхтаваўся да друку, стала вядома, што на форуме афіцыйнага партала горада Баранавічы былі зачыненыя тэмы «Жыве Беларусь!» і «Рэвалюцыя ў Менску правалілася».

## АДНЫМ РАДКОМ

### КРОК У ЕЎРОПУ

Пашыраюцца міжнародныя кантакты моладзевых арганізацый Берасцейшчыны. З 29 сакавіка па 1 красавіка 2005г. з візітам у Любліне (Польшча) знаходзілася кіраўніцтва БАМГА "Сузор'е". Падчас сустрэч у мясцовай фундацыі "Новы Стаў" разглядаліся шляхі актывізацыі супрацоўніцтва моладзі Еўрарэгіёну БУГ (Берасцейшчыны, Валыні, якую прадстаўляла арганізацыя "Наша справа", і Любліншчыны).

Партнёрскія стасункі з Фундацыяй "Новы Стаў" "Сузор'е" наладзіла ў 2004г. Пасля некалькіх удала праведзеных праграм, якія прадугледжвалі адукацыйныя візіты берасцейскай моладзі ў Польшчу, было вырашана правесці стратэгічнае планаванне супольнай дзейнасці. Калі з украінскім бокам "Новы стаў" супрацоўнічае даўно і вельмі актыўна, то моладзевыя арганізацыі Берасцейшчыны да гэтага часу былі рэдкімі гасцямі ў Любліне.

Варта нагадаць, што яшчэ ў 2002г. 9 моладзевых арганізацый Берасцейшчыны выказалі жаданне далучыцца да Пагаднення моладзі Еўрарэгіёну БУГ, якое было заключана паміж моладзевымі арганізацыямі Люблінскчыны і Валыні. Але з-за неканструктыўнай пазіцыі абласнога камітэта БРСМ і супрацьдзеяння берасцейскіх улад спроба навязаць міжнародныя кантакты скончылася няўдачай. Па ацэнках берасцейскіх экспертаў, за прайшоўшыя з таго часу 3 гады каля 800 маладых берасцейцаў маглі б стаць удзельнікамі міжнародных моладзевых праграм.

Падчас візіту ў Люблін былі дасягнуты дамоўленасці па цэлым пакеце праграм, якія прадугледжваюць азнаямляльныя і адукацыйныя паездкі берасцейскай моладзі ў Люблін і Луцк (Украіна), узаемныя візіты і стажыроўкі прадстаўнікоў моладзевых арганізацый Еўрарэгіёну БУГ.

Па словах сакратара Рады БАМГА "Сузор'е" сп. Алены Дзямідзюк, поспех праграм, запланаваных у Любліне, гарантаваны загадзя:

– З аднаго боку, польскае грамадства не жадае, каб на ўсходняй мяжы Польшчы паўстала новая "жалезная заслона". Прычым адна справа, калі чуеш такія словы з высокіх трыбун, і зусім іншая, калі адчуваеш гэта з размовы са звычайнымі маладымі людзьмі, якія сапраўды хочуць мець на ўсходзе добрых сяброў і суседзяў. За Украіну пасля памаранчавай рэвалюцыі можна быць упэўненым, а вось з беларускім рэжымам, які настроены варожа да ўсяго, што дзьме з Захаду, сітуацыя значна больш складаная.

З другога боку, мы самі зацікаўлены ў тым, каб як мага больш берасцейскай моладзі пазнаёмілася з жыццём іх аднагодак на Захадзе. Я ўпэўнена, што гэта паўплывае на светапогляд маладога чалавека значна болей, чым уся машына лукашэнкаўскай прапаганды разам узятая.

Хачу дадаць, што Фундацыя "Новы Стаў", якая дзейнічае ў Любліне ўжо 10 гадоў, мае цэлую сетку партнёраў у краінах Еўропы. І мы будзем прыкладаць усе намаганні, каб Берасцейшчына заняла годнае месца ў еўрапейскіх моладзевых праграмах. Наша задача, каб малады чалавек з Берасця ці з Маларыты меў такія самыя правы ў галіне адукацыі, працаўладкавання і ўзроўню жыцця, як яго аднагодка з Мадрыда ці Любліна, – адзначыла сп. А.Дзямідзюк.

Больш падрабязна аб праграмах для берасцейскай моладзі можна будзе даведацца з рассылкі Dzedzich week-news і на старонках "Дзедзіча".

**Dzedzich week-news**

## АДНЫМ РАДКОМ

### “ПАДПІШЫ СЯБРОЎ!”

«Дзедзіч» абвяшчае акцыю па падпісцы берасцейскай моладзі на папулярную электронную рассылку Dzedzich week-news.

– Быць у курсе ўсіх падзей, што адбываюцца ў моладзевым асяроддзі Берасцейшчыны,

– атрымаць магчымасць паўдзельнічаць у цікавых адукацыйных праграмах, моладзевых абменах з еўрапейскімі краінамі,

– далучыцца да дзейнасці незалежных моладзевых арганізацый,

– трымаць руку на пульсе падзей падчас прэзідэнцкіх выбараў 2006г.,

– стаць удзельнікам “памаранчавай рэвалюцыі па-беларуску” – такія магчымасці дае падпіска на рассылку Dzedzich week-news.

Той, хто падпіша на рассылку 3 сяброў, атрымае фірмовы каляндарык "Дзедзіча", хто падпіша 5 сяброў – ручку з фірмовым лагатыпам, а калі пастарацца і падпісаць 10 чалавек – прызам будзе CD з любой беларускай музыкай альбо відэафільмам на выбар.

Падпісаць сяброў можна самастойна на сайце **www.dzedzich.org**, альбо даслаць іх e-mail на адрас **dzedzich@dzedzich.org**. Калі вы падпісваеце сябра самастойна, не забудзьце даслаць нам ліст з пазначэннем падпісаных вамі адрасаў і вашага кантактнага тэлефона.

**Dzedzich week-news**

### "MATRIX STARS" ВЫХОДЯТ НА СТАРТ.

Вот уже несколько недель, как в Бресте стартовал проект "Фабрыка зорак" или "Matrix stars". Звёздного дома у брестских фабрикантов нет, занятия проходят в помещении клуба "Matrix". Там с ними занимаются педагоги по вокалу, хореографы, проходят занятия актёрского мастерства и сценического движения. Кроме основной группы, в которую вошли 42 человека, есть танцевальная группа, так называемый шоу-балет. Сами участники не очень довольны набранным количеством конкурсантов, поскольку появляются некоторые неудобства: не предназначенный для занятий хореографией зал маловат, да и проще уделять участникам больше внимания, будь их поменьше. Но они всё же признают, что были отобраны лучшие из лучших.

По словам художественного руководителя-Николая Полтораки, конечным результатом этого проекта станет мюзикл, который уже в конце июня увидят жители Бреста. Сюжет мюзикла будет о подростках, об их жизни, переживаниях.

Будут и отчётные концерты, первый из которых уже прошёл 8 апреля. "Первая миссия" фабрикантов выполнена успешно. Из всех участников, были выставлены двадцать: у некоторых коленки тряслись, кто-то выходил очень смело и привычно. Были и такие, кто вообще выходил на сцену впервые. Зрителей порадовали авторскими песнями и самым разнообразным современным репертуаром. Конечно же, выступления не у всех были гладкими, и многим ещё предстоит серьёзная работа по повышению своего мастерства.

Сами ребята говорят, что проект им нравится, на тренировках все очень сплотились, стали дружнее.

Что даст этот проект, пока никто не знает. Увидим в конце июня, ну и, конечно же, на «матричных концертах». Но пока организаторы планируют в будущем проведение таких же "Фабрык".

**Анастасия МЕЛЕШКО**



# "АНТИФА!"

**НАВЕРНОЕ, САМОЙ БОЛЬШОЙ ПРОБЛЕМОЙ ЧЕЛОВЕЧЕСТВА ЯВЛЯЕТСЯ НЕУМЕНИЕ УЧИТЬСЯ НА СВОИХ ОШИБКАХ. ОЧЕНЬ ЖАЛЬ, ЧТО МЕНЕЕ ЧЕМ ЗА 70 ЛЕТ СУЩЕСТВОВАНИЯ ФАШИЗМА СО ВСЕМИ НЕСЧАСТЬЯМИ, КОТОРЫЕ ОН ПРИНЁС ЛЮДЯМ, МНОГИЕ ТАК И НЕ ПОНЯЛИ ВЕЛИКОГО ЗАБЛУЖДЕНИЯ И КРАХА ВСЕХ ФАШИСТСКИХ ИДЕЙ.**

Идеями движения Антифашистов и его продвижения в Бресте со мной поделились Кирилл Маслаков, Псих, Иисус – основатели и активные участники этого движения в Бресте.

**– Кто такие антифашисты?**

– Антифашистом может быть кто угодно, от подростка со школьной скамьи до политика, от заключённого до милиционера. Это просто жизненная позиция, которая отрицает дискриминацию кого-либо по определённым признакам. Мы против расизма, сексизма и прочих ущемляющих человека идей.

**– На какой стадии развития в Бресте находится нацизм, ведь у каждой силы есть противостояние, кому и чему вы противостоите?**




– Всё началось года три назад, – рассказывает Киря. Я пришёл учиться в БрГУ. Там я встретил человека по кличке Борода (Мартынюк Сергей), который распространял идеи фашизма, с нас то всё и заварилось. Долгое время это всё находилось на уровне ребячества, перекидывались "ласковыми словами". Впоследствии, когда Борода стал преподавать в СШ №28, стало появляться больше ребят, называвших себя нацистами.

С осени этого года по их инициативе мы сталкивались в крупных потасовках. Под негативным влиянием некоторых лиц многие подростки с несформировавшейся психикой хотят быть круче, ищут способы, чтобы показать своё превосходство и не находят более достойных занятий, чем ущемлять людей другого цвета кожи. Как ни удивительно, в современном мире существуют фашистские организации. Самая крупная в Европе – Blood & Honour, в России это всем известное РНЕ (русское национальное единство).

**– Скинхэды и фашисты. В чем связь?**

– Многие люди путают скинхэдов с нацистами. Это большое заблуждение. В истории этого движения на самом деле были страницы, в которых имел место фашизм, но это было связано с Англией (это, кстати, родина скинхэдов) и её колониями.

Бонхэды – отделившееся от них направление, – действительно поддерживают расизм. Главными виновникоми неверного толкования скинхэдов были СМИ. Скинхэд – это отдельная субкультура, которая ничего общего не имеет ни с антифашизмом, ни с фашизмом, это люди которые любят одежду определённых марок, и музыку в стиле oi.

**– Как музыка связана с антифашизмом?**

– Места тусовок молодёжи, и то, что их объединяет, всегда было связано с определённой музыкой. Мы проводим концерты с лозунгом "Антифашизм против расизма". На наших концертах чаще всего собираются представители самых разных субкультур: панков, растоманов, меломанов, металлистов, реперов и прочих.

Наверное, музыка – это самое большое явление, объединяющее людей, умеющих думать.

**– Это правда, что атрибутом антифашиста являются красные шнурки?**

– То, что все антифашисты ходят с красными шнурками – просто миф. Конечно, большинство именно с ними и ходят. Наверное, это и к лучшему, ведь это значит, что к нам присоединяются люди, понимающие идиотизм фашистской идеологии. А шнурки носите, какие нравятся. Что касается атрибутики, то мы, в частности, продаём нашивки, майки с соответствующими антифашистскими логотипами. А ещё мы собираем информацию о музыке различных субкультур, саму музыку.

**– Что вы думаете о современной молодёжи, чего ей не хватает? Почему она так легко поддаётся влиянию фашистских идей?**

– Недостаток в уме. Уже было вышеупомянуто, что школьники от 14-17 лет больше всего поддаются влиянию, они пока не думают о том, что нужно зарабатывать деньги, но они и не стремятся к этому, им больше нравится их тратить, а не зарабатывать. Слишком мало активности, им лень изучать то явление, лозунги которого они выкрикивают. К примеру, назвав себя анархистом, молодой человек зачастую не знает, что заключает в себе это понятие.

**– Как вы видите будущее фишизма? И есть ли оно вообще?**

– Нет, можно с уверенностью сказать, что оно умирает, идеи о чистоте крови и прочих рассовых признаках мало кому интересны, большинство помнят последствия, к которым это привело человечество. И можно смело говорить, что каждый человек, не поддерживающий идеи фашизма, – антифашист. Это позиция жизни.

**Беседовала Анастасия МЕЛЕШКО**

## КАРЫКАТУРА АД WI



# УСЕ Ў "АПОСТРАФ"!

**З ПАЧАТКУ 2005г. У БЕРАСЦІ ПРЫ ЦМТ ПАЧАЛА ДЗЕЙНІЧАЦЬ НОВАЯ ІНІЦЫЯТЫВА "АПОСТРАФ". ТАМ ЗБІРАЮЦЦА ЛЮДЗІ, ЯКІЯ ХОЧУЦЬ НАВУЧЫЦЦА ПРЫГОЖА І ПРАВІЛЬНА РАЗМАЎЛЯЦЬ ПА-БЕЛАРУСКУ, ЗАВЕСЦІ НОВЫХ СЯБРОЎ, СУСТРЭЦЦА З ДЗЕЯЧАМІ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ ЦІ НАВЕДАЦЬ ГІСТАРЫЧНЫЯ МЯСЦІНЫ БЕЛАРУСІ.**

Заснавальнікам і кіраўніком клуба "Апостраф" з'яўляецца студэнтка БрДУ Наталля Харытанюк.

З размовы з ёю стала вядома, што "Апостраф" пачаў сваю дзейнасць 9 студзеня 2005г. А ўсё пачалося з жартоўнай прапановы навучыць сваіх сяброў добра размаўляць па-беларуску. Гэтая прапанова спадабалася яе знаёмым, а праз некалькі дзён для добрай справы быў знойдзены пакой у ЦМТ.

Дапамаглі арганізаваць заняткі сябры з "Маладога фронту", менскай моладзевай ініцыятывы "Вока" ды Берасцейская арганізацыя Партыі БНФ.

Першымі сябрамі клуба сталі хлопцы і дзяўчаты з факультэта замежных моў БрДУ, "Маладога фронту". Зараз на заняткі, якія адбываюцца кожны аўторак і нядзелю, прыходзяць школьнікі старэйшых класаў СШ №14, ліцэя №1, студэнты БрДУ, а таксама больш дарослыя людзі, якія шчыра любяць беларускую мову і культуру.

Заняткі ў клубе адбываюцца ў гульнявой форме. Там ніхто не выконвае сумных практыкаванняў і не піша дыктовак, як на занятках у звычайных школах. У клубе ўсе ўдзельнікі вучацца прыгожа і правільна размаўляць на беларускай мове падчас гульняў, слухаючы беларускую музыку альбо чытаючы вершы постмадэрнісцкіх пісьменнікаў. Нехта спрабуе і сам пісаць вершы ці невялічкія апавяданні.

Наталля лічыць, што галоўных задач у "Апострафа" дзве. Па-першае, гэта гуртаванне людзей, якія хочуць размаўляць па-беларуску, слухаць беларускую музыку, ведаць гісторыю роднага краю. А па-другое – даказаць, што беларуская мова – гэта жывая мова, валодаць якой модна і прэстыжна.

Каб выканаць гэтыя задачы, трэба знаходзіць новыя неардынарныя падыходы. У бліжэйшых планах клуба арганізацыя вандровак па гістарычных мясцінах. Напрыклад, адна з такіх вандровак была здзейснена 10 красавіка на радзіму Тадэвуша Касцюшкі каля мястэчка Косава. Плануецца таксама правядзенне альтэрнатыўнай алімпіяды па беларускай мове.

**Янка НОВІК**

**PS.** Клуб "Апостраф" запрашае жадаючых вывучаць беларускую мову кожны аўторак (18.00) і нядзелю (14.00) у ЦМТ, пакой 415.

Тэлефон для даведак: 798-03-42 (Наталля).

## ПОШТА ДЗЕДЗІЧА

### *ПРЫВІТАННЕ, ДЗЕДЗІЧ!*

*Извините что не на **Беларускай мове**.... Вы молодцы... Я не **абыякава** отношусь к нашей стране!!!*

*Я получил номер вашей газеты у нас в Политехе...*

*Как представитель МОЛАДЗІ МЕТАЛЮГ :) утверждаю, что согласиться с вашей публикацией **"Моладзевая субкультура"** не могу. То ли вы что-то не закончили, так как места не хватило, то ли что-то вы забыли написать.*

*Поддерживаю вашу газету. Продолжайте. Я буду читать, если вы будете её выдавать. Даже платно.*

*Только пишите больше про жизнь в Беларуси МОЛОД¨ЖИ!!!*

*А политике, я думаю, ГАЗЕТОЙ мы не поможем. Может я и не прав, вам виднее.*

*И, пожалуйста, если можете, сделайте нововведение – раздел «КРИТИКА»!*

*Чтобы каждый мог выразить свою мысль, похвалу или порицание к объекту или субъекту. А лучшие публикуйте. По-моему, этого не хватает!*

*Удачи ВАМ!*

***Iron_Maiden***

**АД РЭДАКЦЫІ:**

**Паважаны спадар Iron_Maiden.**

**Вельмі ўдзячны Вам за параду наконт удасканалення нашага і вашага :) выдання.**

**Павінны адзначыць, што ў "Дзедзічы" заўсёды існавала рубрыка "Пошта "Дзедзіча", дзе мы друкуем найбольш цікавыя звароты і заўвагі нашых чытачоў. Больш за тое, мы прадастаўляем плошчу нашага выдання для выказвання розных, часам палярных думак. Мы заўсёды рады змясціць на старонках "Дзедзіча" артыкулы, як кажуць, "у працяг тэмы".**

**Таму, калі Вы не згодны з нашымі выказваннямі ці ацэнкамі, калі ласка, пішыце артыкул-адказ, і мы абавязкова яго надрукуем.**

**З павагай, Дзмітрый ШЫМАНСКІ.**

### *ШАНОЎНАЕ СПАДАРСТВА!*

*Удалучэнні да акцыі "Дзедзіча" "ГУКі" хачу выказаць думку пра тое, што Беларуская Музыка складаецца не толькі з папсовых гуртоў!*

*Трэба мець на увазе і старажытнабеларускую музыку!*

*У гэтым сэнсе хацелася б расказаць пра нашыя старажытнабеларускія ансамблі, і самы магутны з іх: «LITUUS» (http://litu.us).*

*Калі хтосьці жадае набыць альбомы з гэтай цудоўнай Музыкай, мыльце лісты да мяне:*

*negotiator_1@mail.ru.*

***З павагай, negotiator***

**АД РЭДАКЦЫІ:**

**Паважаны спадар Negotiator.**

**У музычным архіве "Дзедзіча" ёсць не толькі папсовыя гурты, але і старажытнабеларуская музыка. Але, на жаль, ансамбля Lituus там бракуе. Таму, калі ў Вас ёсць такая магчымасць, калі ласка, прынясіце нам кружэльку з іх спевамі.**

**Будзем Вам вельмі ўдзячныя.**

**Андрусь ЛЯЎЧУК**

## КАНТАКТУЙ З БМА!

Беларуская музыка на касетах і CD. Толькі ў нас пастаянныя святочныя зніжкі!

Набудзь пяць дыскаў – шосты атрымаеш задарма!!! Магчыма дастаўка на дом.

Прапануем заробак распаўсюднікам у Менску і рэгіёнах.

Кантактуй з намі: 8 (029) 649-08-88.

220085, г. Менск, а/с 5, wital@tut.by, www.BMA.home.by.

## АБ'ЯВЫ



Віншуем сп. **МІКОЛУ СІМАНОВІЧА** з абраннем на пасаду сакратара суполкі БРСМ філалагічнага факультэта БрДУ.

Жадаем плённай працы на ніве Адраджэння беларускай культуры сярод моладзі філфака.

**ЖЫВЕ БЕЛАРУСЬ!**

**Брэсцкая гарадская арганізацыя Партыі БНФ**

## ПРИГЛАШАЕМ ВОЛОНТЁРОВ

### ДЛЯ ПОДДЕРЖКИ ЕДИНОГО КАНДИДАТА ОТ ДЕМОКРАТИЧЕСКИХ СИЛ НА ПРЕЗИДЕНТСКИХ ВЫБОРАХ 2006г.

**– Вас не устраивает ситуация в стране, но вы верите, что её можно изменить;**
**– Вы устали верить обещаниям Лукашенко и поддерживаете демократическую оппозицию;**
**– Вы желаете внести свой вклад в возрождение независимой и процветающей Беларуси;**
**– Вам больше 18 лет, и вы можете посвятить часть своего времени избирательной кампании;**
**– Вы хотите приобрести навыки общения с людьми, умения убеждать, взглянуть на выборы изнутри: не как простой избиратель, а как активный участник событий –**

## НАМ НУЖНА ВАША ПОМОЩЬ!

**МЫ ОБЕЩАЕМ:**
**– проведение для вас образовательных семинаров, стажировок как в г. Бресте, так и в других городах и странах;**
**– обеспечение вас всеми необходимыми навыками ведения эффективной агитации;**
**– предоставление возможности продолжить свою политическую карьеру при нашей поддержке;**
**– создание дружеской атмосферы и знакомство с интересными людьми.**

**ЧТО МОЖНО ДЕЛАТЬ: сбор подписей, распространение листовок, расклейка плакатов, агитация, участие в создании предвыборной программы, наблюдение за выборами.**

**ЗВОНИТЕ НАМ В ЛЮБОЕ ВРЕМЯ ПО ТЕЛ:**
**23-68-02, (029) 660-57-41, (029) 725-15-39, 41-12-00.**

**Брестская городская организация Партии БНФ**

## ГІСТАРЫЧНЫ КАЛЯНДАР

### 3 ТРАЎНЯ

Трэцяга траўня 1791г. Сойм Рэчы Паспалітай зацвердзіў **Канстытуцыю** — першую ў Еўропе, другую ў свеце і апошнюю для супольнай дзяржавы Кароны і Літвы. Нашы продкі жылі паводле гэтай канстытуцыі да захопу беларускіх земляў Расейскай імперыяй. З таго часу шмат розных канстытуцый прашалясцела над галовамі беларускага народу, ды ўсе яны былі нейкія недаробленыя і не свае, таму доўга не жылі.

Сённяшняя канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, «падпраўленая» Лукашэнкам на рэферэндумах 1996 і 2004гг., таксама далёкая ад дасканаласці і ад той краіны, якой быццам бы служыць. Шмат хто ў нас гэта разумее, але зрабіць нічога не можа. Усё адно, што з дажджом змагацца.

### 8 ТРАЎНЯ



Восьмага траўня 1999г. знік **Юры Захаранка.** Дзяржаўныя органы за гэты час не прасунуліся ні на крок у росшуку былога міністра ўнутраных справаў, а пасля аднаго з лідэраў апазіцыі. Жонка Захаранкі перакананая, што яе мужа самым брутальным чынам забілі паплечнікі Лукашэнкі. А на гэтым здымку ён яшчэ побач з Віктарам Шэйманам, сённяшнім кіраўніком Адміністрацыі прэзідэнта.

### 15 ТРАЎНЯ



15 траўня ў 1882г. нарадзіўся беларускі акцёр і драматург **Уладзіслаў Галубок**. Яго імя добра вядомае ў культурным асяроддзі беларусаў, асабліва сярод дзеячоў беларускай сцэны. З дзіцячых гадоў ён прабіваў сабе шлях да святла, ведаў, культуры. "У 1896г. за грошы, зробленыя на выгрузцы дроў, я набыў білет на галёрку менскага тэатра. Там і ўзнікла ў мяне думка стаць артыстам..." – расказваў сам Галубок. І ён стаў артыстам, драматургам, арганізатарам вандроўнага тэатру, які з 1932г. называўся Беларускім трэцім дзяржаўным тэатрам.

Вандроўны тэатр пабываў са сваімі спектаклямі ў самых розных кутках Беларусі. Галубок адначасова выконваў абавязкі мастака-дэкаратара, музыканта-выканаўцы і рэжысёра. Аснову рэпертуару складалі яго п'есы: "Пан Сурынта", "Ганка", "Плытагоны", "Пінская Мадонна", "Васіль Хмель", у якіх раскрываецца барацьба беларускага народа за права "людзьмі звацца". Тэатр Галубка карыстаўся выключнай папулярнасцю ў гледачоў.

Ул. Галубок любіў жыццё і людзей, быў сам узнагароджаны ўсенароднай любоўю. Нездарма ён – першы артыст БССР. А вось лёс яго быў тыповым для нацыянальных дзеячоў Беларусі. У 1937г. ён быў рэпрэсаваны, і, паводле афіцыйнай версіі, памёр у няволі ад гіпертанічнай хваробы.

## ТЭЗАЎРУС

# РОЖЫ ДЛЯ ЖЫДОВАК

**БЕЛАРУСКАЯ МОВА, НА ЖАЛЬ, ДАЎНО НЕ МАЕ МАГЧЫМАСЦІ РАЗВІВАЦЦА "НАРМАЛЬНА". УЖО НЕКАЛЬКІ СТАГОДДЗЯЎ ЯЕ ІСНАВАННЮ ЗАМІНАЮЦЬ СУСЕДНІЯ МОВЫ.**

Праўда, хіба нельга знайсці мову, якая зусім не зведала чужога ўплыву, але ў нашым выпадку гэты ўплыў значна больш, чым гэта звычайна бывае. Найбольш відавочна ён праяўляецца ў лексіцы. Гэта не толькі яўныя запазычанні – паланізмы, русіцызмы і да т.п., уплыў гэты праяўляецца і ўскосна. Пра такі ўскосны ўплыў, праілюстраваны асобнымі прыкладамі, і пойдзе ніжэй гаворка.

### РОЖА

У цяперашніх слоўніках гэтая кветка падаецца як "ружа". На тое, што гэта паланізм, паказвае прыраўнанне гэтага слова да такога ж у іншых славянскіх мовах, ды і спосаб яго напісання ў польскай мове – "**гуїа**" – паказвае на этымалагічнае "о" ў гэтым слове, якое толькі ў выніку уласцівых менавіта польскай мове фанетычных працэсаў пачало вымаўляцца як "у".

Чаму ж у беларусаў прыжыўся гэты паланізм? Адной з прычын можа быць тое, што ў расейскай мове слова "рожа" значыць "хара". Любому хвораму на комплекс нацыянальнай ніжшыні гэтага даволі каб ужываць "больш культурнае" "ружа".

А беларускі народ ужывае слова "рожа" без усякіх комплексаў, звяртаючыся да Божай Маці ў сваёй рэлігійнай песні:

"Астрабрамска Маці Божа,
Ты – прачыста майска рожа..."

І нам нішто не павінна замінаць ужываць гэтае слова на сваім натуральным месцы.

### ЖЫД

Слова "яўрэй" – гэта чысты русіцызм. Памятаю, мая бабуля вымаўляла яго з нейкаю натугаю ў голасе, неяк прыблізна так: "ев'рэй", а па-простаму ўжывала слоў (з сімпатыяй да гэтага народа) "жыд", "жыдоўка", "па-жыдоўску".

Слоўнік Яна Станкевіча падае словы: "жыд", "жыдок", "жыдзіца" (жанчына яўрэйскай нацыянальнасці), "паўжыдак", "жыдзіла" (з пазнакай "пагардлівае").

Слова "жыд" нагэтульку пашыранае на ўсёй этнічнай тэрыторыі беларускай, што, здаецца, няма патрэбы гэтую пашыранасць, як і беларускасць яго даводзіць. Тут ужо прычына незамацавання слова "жыд" як літаратурнай нормы крыху іншая. У гэтым выпадку ўжыванне гэтага слова у дадатак часта запынялася рознымі занадта разумнымі рэдактарамі-карэктарамі.

Хрэстаматыйны ўжо прыклад – адмова уключыць верш Купалы "Жыды" ў чарговы зборнік вершаў з-за "непаліткарэктнай" назвы. Цікава, што ў украінцаў сітуацыя падобная (бо былі падобныя гістарычныя ўмовы) – і яны намагаюцца вярнуць сабе сваё спрадвечнае слова "жид" замест "єврей".

Апошнія гады ў некаторых беларускіх выданнях можна сустрэць словы "габрэй", "гэбрай", "габрай". Але калі "яўрэй" – русіцызм, то вышэйпададзеныя словы – гэта чыстыя карыкатуры, штучныя інтэлігенцкія наватворы, стылізаваныя пад беларушчыну, і ад гэтага яшчэ больш шкодныя.

Але можна заўважыць, што і слова "жыд", дзякуй Богу, усё часцей сустракаецца на старонках перыядычных выданняў.

Будзем спадзявацца, што яно запануе ўрэшце ва ўсёй беларускай мове.

### ДЗЯРМО

Яшчэ адным цікавым словам ёсць слова э-э... «дзярмо». Нічога смешнага тут няма. Дзярмо (або дзярно) – гэта дзёран, дзірван. Адзін з вершаў Уладзімера Жылкі пачынаецца так:

"Бяспынна, глуха процьма часу
Глытае хараство і моц.
Заход бяздушным, светлым пасам
Адзначыў свежае дзярмо."

У сваім лісце ад 24.06.1924 да Антона Луцкевіча Жылка "апраўдваецца" так: "Між іншым "дзярмо" і ёсць "дзярмо". Так я чуў на Навагрудчыне і сустрачаў, калі не мыляюся, у Шэйна, і чаму б так не пакінуць у зборніку? Мая вялікая просьба – быць да аўтара ласкавым, і калі што і не так, калі што спрэчна, то вырашаць на карысць пісакі."

Аднак у некаторых выданнях (Пожні. с. 50; Творы. с. 45) гэтае слова ўсё ж замененае на "дзярНо", насуперак рыфме (з словам "моц", якая вымагае якраз формы "дзярмо"). Пазбаўляймася забабонаў у дачыненні да гэтага беларускага слова.

Коратка яшчэ пра колькі слоў.

**"Прыбор"** – у беларускай мове гэтае слова значыць "аздоба", "упрыгожанне", і гэта пры тым, што само слова "ўпрыгожваць" гэта калька з расейскай мовы ("у" + "крашать"). Дык ясна, што лепей ужываць "прыбор", "прыбіраць".

**"Харошы"** – замест яго ў нас ужываюць часцей "прыгожы". І гэта дзіўна, бо словы "харошы", "хараство", "харашыня" нашмат больш пашыраныя. Часцейшаму ўжыванню мабыць зноў жа замінае, на жаль, тое, што ў расейскай мове слова "хороший" мае значэнне "добры", і пры шырокім распаўсюджанні ў нас расейскай мовы сэнс гэтага міжмоўнага пароніма можа зацямняцца.

**"Пазорны"** – гэта значыць "харошы з выгляду", "пазорная дзяўчына" – гэта камплімент. Вельмі пашыранае слова: зафіксавана ў слоўніках Шатэрніка, Насовіча, у творах Крушыны, таксама на Вілейшчыне, Случчыне, Ігуменшчыне. І чаму яно не зрабілася нарматыўным? Проста дзіўна. Мабыць і тут не абышлося без "ўскоснага ўплыву" расейскай мовы.

Які будзе вывад з напісанага? Здаецца, мірнага сужыцця беларускай і расейскай моў дасягнуць нельга ў прынцыпе. Так што ці мы, ці яны. Слова "кампраміс" трэба забыць. А на чый бок стаць – хай вырашае кожны для сябе сам.

**Юрка АГІЕВІЧ**

**Рэдакцыя бюлетэня «ДЗЕДЗІЧ»**
**запрашае да супрацоўніцтва карэспандэнтаў з Берасця і гарадоў вобласці.**
**Калі вы жадаеце выказаць свае думкі на нашых старонках, тэлефануйце:**
**(0162) 23-68-02.**

# ГЕНОЦИД НАРОДА

**НАСИЛИЕ В СОВЕТСКОМ ОБЩЕСТВЕ БЫЛО ВСЕГДА. С 1917Г. ОНО ЯВЛЯЛОСЬ ОСНОВНЫМ СРЕДСТВОМ ДЛЯ РЕШЕНИЯ ВСЕХ СОЦИАЛЬНЫХ ПРОБЛЕМ. ГДЕ, В КАКОЙ ДРУГОЙ СТРАНЕ УСТАНОВЛЕНИЕ НОВОГО ОБЩЕСТВЕННОГО ПОРЯДКА СОПРОВОЖДАЛОСЬ ПРОЛИТИЕМ ТАКОГО МОРЯ КРОВИ – КРОВИ МИЛЛИОНОВ ЧЕЛОВЕЧЕСКИХ ЖЕРТВ!**

Беларусь за короткий срок – немногим более трёх десятилетий – пережила величайшие потрясения: гражданскую войну, коллективизацию, массовые политические репрессии и вторую мировую войну, депортацию жителей в отдалённые районы СССР.

Если человека унизили страхом, надругались над его правами – об этом следует, по крайней мере, помнить. Но если человек принимает унижение как неизбежность, а потом вообще забывает, что его унизили, он воспринимает затем своё унижение как нечто обыденное и естественное. Забвение преступлений русского шовинизма приводит к уничтожению чувства национального достоинства народов. Общество подошло к краю пропасти, и только нравственность – его инстинкт самосохранения – поможет спасению.

Первые белорусы оказались в сибирских лагерях ещё в начале 1920-х гг. В Маиинском концлагере, где заключённые отбывали свой срок за контрреволюцию (56%), уголовное преступление (23%), невыполнение развёрстки (4,4), антисоветскую агитацию (8%) и спекуляцию (0,1%), было не менее 5% белорусов.

Кампания "раскулачивания" 1930г. имела своё определённое "лицо" и свои приоритеты – конфискационно-репрессивные. С помощью этой компании власти боролись не только с противниками колхозов, но и решали ближайшие задачи – выселение раскулаченных и противников советской власти. Высылка началась в январе-феврале 1930г. По данным статистики ОГПУ-НКВД в СССР в 1930-1931-е гг. в отдалённые районы отправлено свыше 15000 семей из Беларуси.

В феврале 1931г. началась новая волна репрессий. В результате из Беларуси было выслано в районы Сибири свыше 60 тысяч крестьян. По оценочным данным, в Беларуси в 1920-1940-е гг. было "раскулачено" не менее 350 тысяч человек.

Новая разрушительная волна массовых репрессий обрушилась в 1937-1938-х гг. Особенно активизировалась деятельность НКВД БССР с июля 1937г., когда, согласно указанию "сверху", на местах были составлены списки, содержащие весь "контрреволюционный элемент". Вслед за этим в Беларуси начались массовые операции по осуществлению арестов и фабрикации "контрреволюционных дел". Смысл этих акций сводился к созданию так называемых контрреволюционных национал-фашистских, Польской организации войсковой, контрреволюционно-диверсионной и других антисоветских организаций.

Хотя до сих пор на территории Беларуси не выявлено наличие в 1930-1940-е гг. исправительно-трудовых лагерей, это вовсе не означает их реального отсутствия. В пересыльных тюрьмах и лагерях в Минске, Витебске, Могилёве, Слуцке, Гомеле содержался одновременно "спецконтингент" в 15-20 тысяч человек.

